# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

3 ВЕРАСНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15893)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

**«NИТN»:**

# «Маглі б іграць нават на Месяцы»




**Наша сустрэча адбылася ў незвычайным дворыку адной андэграўнднай сталічнай кавярні. Месца было выбрана музыкантамі невыпадкова, яно ў нейкім сэнсе характарызуе іх — свабодных, харызматычных, маладых і амбіцыйных. Знаёмцеся — бас-гітарыст, вакаліст і лідар калектыву Ягор ТРАЦЦЯКОЎ-САВІЧ, вакалістка Аксана КУЖАЛЕВА і гітарыст Марык КОР.**

**Нават не скажаш, што перад табой сапраўдныя рок-музыканты, настолькі сціплымі здаліся мае суразмоўнікі. Але, аказваецца, за сціпласцю рабят хаваюцца неўтаймаваная энергія, ураган і сапраўдны талент. І гэта пачынаеш адчуваць, як толькі гаворка заходзіць пра творчасць...**

***— Раскажыце пра свой гурт. Чаму такая назва?***

**Ягор:** — Пра тое ёсць трэк, праўда, мы даўно яго не выконвалі. Усе звязаны паміж сабой нябачнымі ніцямі. Нехта хоча падпарадкоўвацца ім, хтосьці не. Гэта датычыцца і нас як гурта, і людзей увогуле. Нішто не выпадкова, ніхто не выпадковы.

А пачалося ўсё яшчэ ў школе. Прыйшла ідэя, а чаму б не паспрабаваць пісаць самім песні, прыдумваць, самастойна пачаць штосьці рабіць. З сябрамі пайшлі на летнія работы, падзарабілі грошай, набылі свае першыя гітары. Я — бас, мой сябар — электра (і так далей па нарастаючай), потым пазнаёміліся з Лёнем (барабаншчыкам Леанідам Вішнеўскім. — **Аўт.**), знайшлі вакалістку. Пачаліся змены ў складзе. Былі і доўгія перапынкі, пошукі сябе, розныя перыяды ў жыцці. Першы раз мы сабраліся дзесьці ў 2006-м. Праўда, не гэтым складам. Цяперашні — з канца кастрычніка—лістапада 2019-га.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Класныя навіны*

## ШКОЛА БУДУЧЫНІ: БЕЗ «ФІЗІКАЎ» І «ЛІРЫКАЎ»

### Чаму для прадстаўнікоў пакалення Alfa важна забяспечыць альтэрнатыву?

**«Першая рэч, якую трэба памятаць: у свеце цяпер канфуз, замяшанне ад мноства, занадта вялікага мноства опцый. Як жа мне выбраць правільна, калі вакол так шмат усяго, але ўсё кожны дзень змяняецца? Свет прапануе нам шмат магчымасцяў, але гэта свет, у якім усё стала вельмі няўстойлівым, нестабільным. Мы цікавімся ў самых розных людзей у розных краінах свету: чаго вы хочаце? Людзі не ведаюць! Таму што доўгі час мы жылі, адштурхоўваючыся ад таго, чаго чакаюць ад нас бацькі, сваякі, грамадства. І жыццё ардынарнага, звычайнага чалавека было прадвызначанае — месцам яго нараджэння, сям'ёй, акружэннем. А цяпер няма ніякіх іерархій, няма межаў, няма нічога немагчымага, але адваротны бок такога багацця перспектыў — поўная разгубленасць: я такі малады, я не ведаю, чаго хачу, хто я... Пра гарантыі сёння наогул трэба забыцца, іх няма, трэба быць гатовымі пастаянна змяняцца і перавучвацца», — такой думкі прытрымліваюцца прафесары Нацыянальнага ўніверсітэта Сінгапура Крыстал Лім-Лэнге і Грэг Лім-Лэнге — прызнаныя міжнародныя эксперты ў вобласці адукацыі, аўтары бестселера Deep Human.**



**Якой жа павінна быць сучасная школа, каб адпавядаць патрэбам часу? Якія навыкі актуальныя для навучэнцаў? Чым павінен напаўняцца адукацыйны кантэнт? Чаму вельмі важная магчымасць выбару? Пра ўсё гэта ішла гаворка падчас 3-й канферэнцыі па альтэрнатыўнай адукацыі.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*Знайсці сябе*

## МАДЭЛЬ ЖЫЦЦЯ,

### або Як не ўпусціць уласнае мора магчымасцей

**Бывае так, што чалавек усё жыццё працуе ў адным кірунку, ідзе да сваёй мэты прама і ўпэўнена. Але аднойчы здараецца нечаканы выпадак, які праліваае святло на схаваныя ўнутры асобы здольнасці да іншай сферы дзейнасці. Менавіта ў гэты момант перад вачыма з'яўляецца вялікае мора магчымасцяў. Але ці кожны асмеліцца на рызыку? Танцорка, трэнер і бізнесвумен Крысціна БАРАКСАНАВА ніколі не баялася спрабаваць нешта новае і менавіта дзякуючы гэтаму стала мадэллю. Зусім выпадкова, але знайшла справу для душы.**



Бальнымі танцамі дзяўчына пачала займацца ва ўзросце чатырох гадоў. Яны сталі галоўным захапленнем сярод вялікай колькасці іншых. Разам са студыяй Крысціна аб'ездзіла з канцэртамі Еўропу. Так прайшлі доўгія і насычаныя дзесяць гадоў.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*